◄◄◄ 1 стар.

# Дзённік конкурсу "Звонкая раніца – 4"

**11 студзеня. Дзень першы. Заезд**

Чаго можна чакаць ад першага дня? Мітусня, рассяленне, распакоўванне рэчаў і канцэртных касцюмаў... Аднак самай важнай падзеяй першага дня было вочнае знаёмства, таму што паміж сабой фіналісты конкурсу "Звонкая раніца" ўжо паспелі пазнаёміцца ў сацыяльных сетках і на кастынгах.

**12 студзеня. Дзень другі. Першыя знаёмствы**

З самай раніцы ўдзельнікам "Звонкай раніцы — 4" не давялося сядзець без справы. Набраўшыся сіл пасля снедання, удзельнікі раздзяліліся на групы і адправіліся на свае першыя ў гэтым конкурсе заняткі па вакале.

Мне ўдалося пабываць на занятках толькі адной групы, пад кіраўніцтвам таленавітага педагога А.І.Чарняўскай. Натуральна, першы ўрок — уводны. Алеся Іванаўна расказала дзецям, што такое вакал, паказала некалькі практыкаванняў. Але і канкурсанты без справы не сядзелі. Яны актыўна паўтаралі ўсё тое, што паказваў педагог, а пасля кожны праспяваў фрагмент песні, якая прагучыць у іх выкананні на першым этапе конкурсу. Памылкі, канечне, былі, але дзяцей гэта не спыніла, а, наадварот, надало сіл, каб ісці далей. Кожны ўпэўнены ў сваіх сілах і кожны настроены на перамогу. А рэгулярныя заняткі і выкладванне па поўнай праграме зробяць сваю справу.

Пасля заняткаў па вакале дзяцей чакала Аліса Андрэеўна Матвяюк, выкладчык акцёрскага майстэрства. Канкурсантам, акрамя спявання, давядзецца праявіць сябе і ў якасці акцёра, бо выступаць на сцэне — гэта вельмі няпростая задача. А справіцца з гэтым ім дапаможа Аліса Андрэеўна. І на першых занятках яна расказала дзецям, навошта ім трэба акцёрскае майстэрства, а таксама паказала некалькі практыкаванняў, якія дзеці з задавальненнем паўтаралі. Але з першых жа хвілін дзеці зразумелі, што расслабіцца ім не дадуць. Аліса Андрэеўна папярэдзіла, што працаваць давядзецца многа. А для дасягнення сваёй мэты канкурсанты гатовы на ўсё.

Працягнуўся другі дзень "Звонкай раніцы — 4" у вялікай актавай зале. Там прайшла першая рэпетыцыя канцэрта, які пройдзе ў дзень адкрыцця змены. Танцавальныя калектывы, якія будуць суправаджаць многія нумары канкурсантаў, сёння выклаліся поўнасцю. Ды і салісты не адставалі. Усё-такі адкрыццё змены — справа сур'ёзная, тут схібіць нельга. Стараюцца абсалютна ўсе.

А скончыўся дзень канцэртам выкладчыкаў. Педагогі праекта — Аліна Сяргееўна Дзямідава, Алеся Аляксандраўна Ганчарова, Алеся Іванаўна Чарняўская і Аліса Сяргееўна Мацевяюк — далі майстар-клас па рабоце на сцэне. Таксама ў канцэрце прынялі ўдзел запрошаныя на конкурс танцавальныя калектывы "Драйв", "Экшн" (Петрыкаў Гомельскай вобласці) і "Эльфрыданс" (Горкі Магілёўскай вобласці) і вядучая канцэртаў конкурсу фіналістка "Звонкай раніцы — 3" Лізавета Ражкова. Дарэчы, тыя, хто не змог паглядзець анлайн-трансляцыю гэтага канцэрта, могуць убачыць яго відэазапіс на нашым сайце www.zr.ng-press.by.

**13 студзеня. Дзень трэці. Стары Новы год**

Новы дзень быў нялёгкі. Але цяжкасці на гэтым конкурсе — справа звычайная. Пасля снедання дзеці пайшлі ў школу. Хай на двары і 14 студзеня, а стварылася ўражанне, што за вокнамі 1 верасня і дзеці ідуць у школу першы раз. Педагогі сустрэлі новых вучняў традыцыйнай прэзентацыяй школы "Зубраня" і пажадалі поспехаў на найбліжэйшыя 20 дзён.

Пасля вучобы канкурсанты адправіліся на першы ўрок харэаграфіі, які правяла для іх Алена Мікалаеўна Лызікава, кіраўнік ансамбля "Эльфрыданс". Дзеці пастараліся як мае быць, і педагог ацаніла гэта. Не варта забываць і пра тое, што заняткі ў канкурсантаў па вакале, харэаграфіі і акцёрскім майстэрстве будуць праходзіць кожны дзень, бо гэта адзін з асноўных элементаў конкурсу.

А вечарам абстаноўку разрадзіла навагодняе прадстаўленне, пастаўленае важатымі. Як у любой навагодняй казцы, былі і Снежная каралева, і Снягурачка, і Дзед Мароз, і, як у кожнай казцы, дабро перамагло зло.

Да канца трэцяга дня дзеці ўжо паспелі пасябраваць адно з адным, і канкурсанты становяцца не супернікамі, а паплечнікамі.

**14 студзеня. Адкрыццё**

Ну вось мы і дачакаліся адкрыцця змены. Увесь дзень актыўна ішлі рэпетыцыі, дзеці расспяваліся і танцавалі, а трохі пазней ва ўсёй красе паказалі сябе на цырымоніі адкрыцця змены "Я родным краем ганаруся!". Адбыліся і першыя выступленні канкурсантаў на зубраняцкай сцэне.

Змена адкрыта. Старт дадзены. А ўсяго праз некалькі дзён мы ўбачым першыя канцэрты фіналу "Звонкай раніцы — 4". Але аб гэтым больш падрабязна ў наступным дзённіку конкурсу.

**P.S.: Не забывайцеся, што да 29 студзеня будзе доўжыцца СМС-галасаванне*, праз якое вы можаце падтрымаць канкурсанта, які вам падабаецца.**

*Увага! Галасаванне платнае. Кошт СМС высвятляйце ў свайго мабільнага аператара.

**Карына РЫЖКОВА,**
**Уладзімір ФАЛАЛЕЕЎ.**

# Рейтинг учреждений высшего образования Республики Беларусь по приемной кампании 2013 года

| Наименование учреждения высшего образования | Позиция в рейтинге |
|---|---|
| БЕЛОРУССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ | 1 |
| БЕЛОРУССКИЙ НАЦИОНАЛЬНЫЙ ТЕХНИЧЕСКИЙ УНИВЕРСИТЕТ | 2 |
| БЕЛОРУССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ ИНФОРМАТИКИ И РАДИОЭЛЕКТРОНИКИ | 3 |
| БЕЛОРУССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ЭКОНОМИЧЕСКИЙ УНИВЕРСИТЕТ | 4 |
| МИНСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ЛИНГВИСТИЧЕСКИЙ УНИВЕРСИТЕТ | 5 |
| БЕЛОРУССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ МЕДИЦИНСКИЙ УНИВЕРСИТЕТ | 6 |
| ГРОДНЕНСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ им. ЯНКИ КУПАЛЫ | 7 |
| ВИТЕБСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ОРДЕНА ДРУЖБЫ НАРОДОВ МЕДИЦИНСКИЙ УНИВЕРСИТЕТ | 8 |
| ГОМЕЛЬСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ им. ФРАНЦИСКА СКОРИНЫ | 9 |
| ГРОДНЕНСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ МЕДИЦИНСКИЙ УНИВЕРСИТЕТ | 10 |
| ВИТЕБСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ им. П.М.МАШЕРОВА | 11 |
| БРЕСТСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ им. А.С.ПУШКИНА | 12 |
| ГОМЕЛЬСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ МЕДИЦИНСКИЙ УНИВЕРСИТЕТ | 13 |
| БРЕСТСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ТЕХНИЧЕСКИЙ УНИВЕРСИТЕТ | 14 |
| ПОЛОЦКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ | 15 |
| БЕЛОРУССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ТЕХНОЛОГИЧЕСКИЙ УНИВЕРСИТЕТ | 16 |
| БЕЛОРУССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ ТРАНСПОРТА | 17 |
| БЕЛОРУССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ПЕДАГОГИЧЕСКИЙ УНИВЕРСИТЕТ им. М.ТАНКА | 18 |
| БЕЛОРУССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ КУЛЬТУРЫ И ИСКУССТВ | 19 |
| МОГИЛЕВСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ им. А.А.КУЛЕШОВА | 20 |
| ПОЛЕССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ | 21 |
| БЕЛОРУССКАЯ ГОСУДАРСТВЕННАЯ ОРДЕНОВ ОКТЯБРЬСКОЙ РЕВОЛЮЦИИ И ТРУДОВОГО КРАСНОГО ЗНАМЕНИ СЕЛЬСКОХОЗЯЙСТВЕННАЯ АКАДЕМИЯ | 22 |
| БЕЛОРУССКО-РОССИЙСКИЙ УНИВЕРСИТЕТ | 23 |
| БАРАНОВИЧСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ | 24 |
| БЕЛОРУССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ АГРАРНЫЙ ТЕХНИЧЕСКИЙ УНИВЕРСИТЕТ | 25 |
| БЕЛОРУССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ ФИЗИЧЕСКОЙ КУЛЬТУРЫ | 26 |
| ГРОДНЕНСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ АГРАРНЫЙ УНИВЕРСИТЕТ | 27 |
| ВИТЕБСКАЯ ОРДЕНА «ЗНАК ПОЧЕТА» ГОСУДАРСТВЕННАЯ АКАДЕМИЯ ВЕТЕРИНАРНОЙ МЕДИЦИНЫ | 28 |
| ГОМЕЛЬСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ТЕХНИЧЕСКИЙ УНИВЕРСИТЕТ им. П.О.СУХОГО | 29 |
| БЕЛОРУССКАЯ ГОСУДАРСТВЕННАЯ АКАДЕМИЯ МУЗЫКИ | 30 |
| МОЗЫРСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ПЕДАГОГИЧЕСКИЙ УНИВЕРСИТЕТ им. И.П.ШАМЯКИНА | 31 |
| МЕЖДУНАРОДНЫЙ УНИВЕРСИТЕТ «МИТСО» | 32 |
| МОГИЛЕВСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ ПРОДОВОЛЬСТВИЯ | 33 |
| БЕЛОРУССКАЯ ГОСУДАРСТВЕННАЯ АКАДЕМИЯ ИСКУССТВ | 34 |
| МЕЖДУНАРОДНЫЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ЭКОЛОГИЧЕСКИЙ УНИВЕРСИТЕТ им. А.Д.САХАРОВА | 35 |
| ВИТЕБСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ТЕХНОЛОГИЧЕСКИЙ УНИВЕРСИТЕТ | 36 |
| БЕЛОРУССКИЙ ТОРГОВО-ЭКОНОМИЧЕСКИЙ УНИВЕРСИТЕТ ПОТРЕБИТЕЛЬСКОЙ КООПЕРАЦИИ | 37 |
| БИП — ИНСТИТУТ ПРАВОВЕДЕНИЯ | 38 |
| МИНСКИЙ ИНСТИТУТ УПРАВЛЕНИЯ | 39 |
| МИНСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ВЫСШИЙ АВИАЦИОННЫЙ КОЛЛЕДЖ | 40 |
| ИНСТИТУТ ПАРЛАМЕНТАРИЗМА И ПРЕДПРИНИМАТЕЛЬСТВА | 41 |
| ИНСТИТУТ ПРЕДПРИНИМАТЕЛЬСКОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ | 42 |
| МИНСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ВЫСШИЙ РАДИОТЕХНИЧЕСКИЙ КОЛЛЕДЖ | 43 |
| ИНСТИТУТ СОВРЕМЕННЫХ ЗНАНИЙ | 44 |
| ВЫСШИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ КОЛЛЕДЖ СВЯЗИ | 45 |
| ЧАСТНЫЙ ИНСТИТУТ УПРАВЛЕНИЯ И ПРЕДПРИНИМАТЕЛЬСТВА | 46 |
| МЕЖДУНАРОДНЫЙ ГУМАНИТАРНО-ЭКОНОМИЧЕСКИЙ ИНСТИТУТ | 47 |

## Методика расчета рейтинга учреждений высшего образования Республики Беларусь по приемной кампании 2013 года

**1. Цель составления рейтинга:** оценить потенциал студентов I курса учреждений высшего образования в 2013 году.

**2. Система критериев оценки:** для оценки учитывались как количественные показатели (количество абитуриентов, принятых в УВО за счет средств бюджета; количество абитуриентов, принятых на условиях оплаты и др.), так и качественные показатели (проходной балл по специальности).

**3. Для расчета составляющих рейтинга использовались данные:**

- статистической отчетности по форме ведомственных статистических наблюдений **1-вуз зачисление бюджет** "Отчет об итогах зачисления абитуриентов на обучение за счет средств бюджета на дневную форму получения образования в учреждение высшего образования государственной формы собственности в 2013 году". Срок предоставления информации — не позднее 3 августа; **1-вуз зачисление** "Отчет об итогах зачисления абитуриентов в учреждение высшего образования в 2013 году". Срок предоставления информации — не позднее 9 августа по дневной форме получения образования; 11 августа — заочной и вечерней;

- собранные Центром международного сотрудничества РИВШ по запросу Министерства образования о количестве зачисленных на обучение иностранных граждан (письмо от 15.10.2013 № 14-30/2956/дс).

**4. Формула для расчета рейтинга вуза по приемной кампании:**

$$A=((\Sigma_{спец} Z_б \times П_б)+(\Sigma_{спец} Z_в \times П_в)) \times K_ц+400 \times Z_{бэ}+400 \times Z_{ин},$$

где

A — сумма баллов, набранных студентами по всем специальностям, с учетом выполнения контрольных цифр приема;

$Z_б$ — количество абитуриентов, принятых на бюджет по определенной специальности;

$Z_в$ — количество абитуриентов, принятых на условиях оплаты по определенной специальности;

$П_б$, $П_в$ — проходной балл по определенной специальности для абитуриентов, принятых за счет бюджета и на условиях оплаты соответственно;

Суммирование идет в рамках одного вуза по всем специальностям.

$Z_{бэ}$ — количество абитуриентов, зачисленных в УВО без вступительных экзаменов (победители международных и республиканских олимпиад, творческих конкурсов и фестивалей, лауреаты специальных фондов Президента Республики Беларусь);

$Z_{ин}$ — количество зачисленных иностранных граждан;

$K_ц$ — процент выполнения контрольных цифр приема.

**По данным Министерства образования Республики Беларусь.**

Дзяржаўнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку", ЛП № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, праспект Незалежнасці, 79. Тыраж 46.000 экземпляраў. Заказ № 45.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ